# Адкрываючы роднае

## *Літаратурная спадчына Пухавіцкай зямлі*

У Магілёўскім універсітэце імя А.А.Куляшова я вучыўся і працаваў у адзін час з вядомым беларускім археолагам Вячаславам Фёдаравічам Капыціным. Ён даследаваў фінальны палеаліт і мезаліт Верхняга Падняпроўя, працаваў над археалагічнай картай Магілёўскай вобласці. На раскопках помнікаў археалагічных культур каменнага веку разам з ім заўсёды працавалі студэнты. Яны з Вячаславам Фёдаравічам абышлі ўсе старадаўнія сцяжынкі і дарогі, рукамі перабралі-перасыпалі тоны злеглай за стагоддзі зямлі, знайшлі і ўсім нам паказалі найкаштоўнейшыя артэфакты, якія прыйшлі да нас ад прашчураў, што некалі засялялі берагі беларускіх рэк. Начавалі ў палатках, ежу гатавалі на вогнішчы, прычым рыба для юшкі здабывалася тут, на месцах раскопак, і так, як здабывалі яе старажытныя людзі, а пасля — доўгія размовы пад зорным небам пра гісторыю нашай радзімы, пра людзей, якія яе стваралі, пра казачна прыгожыя мясціны, якія яны выбіралі для сваіх стаянак і паселішчаў. Капыціна студэнты абагаўлялі, а я, назіраючы за яго працай, думаў пра тое, што гэта і ёсць важкае ідэалагічнае выхаванне — прадметнае, аўтарытэтнае, разумнае, паслядоўнае. Сапраўднае пачуццё гордасці за гісторыю сваёй зямлі, адчуванне велічы чалавечага розуму і прагі да жыцця, сваёй злітнасці са старонкамі глыбокай старажытнасці — вучні Капыціна ўсё гэта ўбіралі ў сябе непасрэдна, а значыць, на ўсё жыццё.

Вячаслаў Фёдаравіч усім сваім сябрам і калегам нястомна расказваў пра іх родныя мясціны. Нехта нарадзіўся прама на гандлёвым шляху з вараг у грэкі, а ў некага бацькі і цяпер жывуць пасярод старажытнага парку, а каля вёскі аднаго з нашых сяброў у Вялікую Айчынную вайну быў страшэнны бой, у якім ніхто з чырвонаармейцаў не выжыў, таму гэтую гісторыю ніхто і не ведаў. Мне асабіста, напрыклад, Капыцін расказаў пра маю маленькую вёсачку Вотня ў Быхаўскім раёне такую гісторыю, што пачуццё гордасці за сваю малую радзіму мяне да гэтага часу проста перапаўняе. Гэтая вёсачка на высокім беразе Дняпра ўнесена ва ўсе знакавыя археалагічныя даведнікі свету, таму што ўжо ў XX стагоддзі была важным гандлёвым цэнтрам, на яе тэрыторыі пры раскопках курганоў археолагі знайшлі арабскія залатыя манеты і грошы часоў кіеўскага князя Уладзіміра Краснае Сонейка. Як вам гэтая вёсачка?!.

Да тых метадаў ідэалагічнай работы, якімі кіраваўся археолаг Капыцін, з цягам часу мяне вярнуў пісьменнік Алесь Мікалаевіч Карлюкевіч. Пры гэтым двойчы. Першы раз гэта было ў час маёй работы міністрам адукацыі. Алесь Мікалаевіч быў тады галоўным рэдактарам газеты "Літаратура і мастацтва". Мы сімпатызавалі адзін другому, ён даваў чытаць мне свае кнігі, па службе і па дружбе я чытаў яго газету. І аднойчы мне на вочы трапілася маленькая заметка. У рэдакцыю пісала мама двух хлапчукоў, гадоў васьмі і дзесяці. Яе муж — апантаны рыбак, кожныя выхадныя ўсю сям'ю садзіць у машыну і вывозіць на якую-небудзь рэчку ці на возера. І заўсёды ў розныя мясціны. Сам ловіць рыбу, расказвае гэтая жанчына, хлопчыкі на адным месцы падоўгу ўседзець не могуць, а яна па відавочных прыметах кожны раз вызначала, што яны знаходзяцца ў нейкіх гістарычных мясцінах. Але расказваць пра іх сынам нічога не магла, бо не ведала зусім нічога пра гэтыя мясціны. Жанчына ў сваім пісьме прапаноўвала неяк адзначыць гэтыя мясціны — дарожнымі знакамі, спецыяльнымі стэндамі, проста памятнымі пазнакамі. Прыцягнуць да гэтай справы раіла школьнікаў, студэнтаў, настаўнікаў, журналістаў, дарожнікаў, службы ДАІ. Зрабіць усё гэта ў адным стылі і ўсюды падрыхтаваць і выдаць адпаведныя карты, паказальнікі. Мы з Алесем Мікалаевічам абмеркавалі гэтую прапанову, а намеснік міністра адукацыі Таццяна Мікалаеўна Кавалёва ўвогуле захапілася ідэяй. Са сваёй ідэалагічнай службай распрацавала план рэспубліканскай акцыі "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся!". І шмат што ўдалося зрабіць.

Другім разам Алесь Мікалаевіч вярнуў мяне да дзейсных форм ідэалагічнай работы сваёй кнігай "Пухавіччына: літаратурнае гняздо Беларусі". Ён мне яе падарыў. І я гэтую кнігу з таго часу чытаю, перачытваю, суперажываю яе героям, вандрую разам з аўтарам па яго родных мясцінах. У мяне склалася ўражанне, што як толькі Алесь Мікалаевіч навучыўся пісаць, ён адразу пачаў збіраць матэрыялы пра літаратурную Пухавіччыну. Прынамсі, школьнікам ён гэта рабіў дакладна. Выбраў сабе прафесію ваеннага карэспандэнта, служыў у Сярэдняй Азіі, на Кубе, у Беларусі. Увесь гэты час збіраў звесткі пра лёсы сваіх землякоў-пісьменнікаў. Рэдагаваў газеты "Чырвоная змена", "Літаратура і мастацтва", "Звязда", працаваў міністрам інфармацыі. І працягваў пісаць пра сваіх землякоў, пра родныя мясціны, пра літаратурную Пухавіччыну. Ён прайшоў і аб'ехаў усе вёскі і мястэчкі, усе хутары і нават асобныя хаціны леснікоў у лясных трушчобах — і ўсюды знаходзіў сляды творчасці мясцовых паэтаў, празаікаў, краязнаўцаў.

Чытаць Карлюкевіча цікава, у кожнага свайго героя ён укладвае паважлівае стаўленне і да яго, і да яго творчасці... А колькі на нашай беларускай зямлі нараджалася таленавітых людзей! Яны былі простымі сялянамі, рабочымі, настаўнікамі, урачамі, але не маглі не займацца творчай працай. Напісанне вершаў, празаічных тэкстаў для іх было неабходным праяўленнем іх штодзённага жыцця, іх натуральным станам. Гэтыя пісьменнікі, паэты з народа друкаваліся ў мясцовых і рэспубліканскіх газетах, выдавалі тоненькія кніжачкі на жоўтай паперы. Але якія праніклівыя словы яны знаходзілі пра сваю вёску, пра людзей, з якімі жылі побач, пра навакольную прыроду. Вельмі многае з напісанага бясследна знікла. Гады грамадзянскай вайны, час рэпрэсій, Вялікая Айчынная вайна забралі многіх, у тым ліку і вельмі таленавітых. Таму Алесь Мікалаевіч у сваёй кнізе імкнецца ні пра каго не забыцца, хаця б крышачку ўсім нам нагадаць, як трэба любіць сваю зямлю, шанаваць і берагчы навакольны свет. Вось для прыкладу ўрывак з апавядання Сымона Хурсіка са Снусціка:

"Неабсяжная далячынь.

Дзесьці далёка перасеклася неба з зямлёю. А дзе — не відна. Там кволіцца сінь. Яна мітусіцца, трапечацца, як летуцень, як радасць чалавечая. Трывожыць думы і жаданні, як песня ціхая, што боль заспакойвае, абяцае штосьці нязнанае і прыгожае ды вабіць, цягне да сябе, як ласка дзявочая.

Па зялёнай роўнядзі пчаліным роем хутары сыпаліся. Злева — смяецца, звіваецца, як бліскучы каснік, жыццярадасная ціхаплыўная рэчка. Далей — бясконцыя маўклівыя палі.

З правага боку — стары каранасты лес. Ціхая задума, як штосьці непазбыўнае, агарнула яго. Лес думае, марыць аб чымсьці, і не пазнаць — весела ці сумна яму.

У такт яго думкам штапуе паветра белымі стрэламі шэры млын, што прысеў у беразе каля ракі... "

Як жа следам за краязнаўцам не захапіцца такім тэкстам!.. Як можна згубіць, забыцца на такія радкі?!.

А вось верш сціплага бібліятэкара з вёскі Голацк Аляксандра Пікуліка:

*Упала зорачка з нябёс,*
*Агністы след уначы растаяў.*
*Які яе чакае лёс*
*Там, за небакраем?*
*Чароўнай папарацю-кветкай?*
*Душу чыюсьці забярэ,*
*Каб зноў вандроўнічаць ў Сусвеце.*
*У кожнага свой зорны шлях.*
*А мы упоцемках блукаем.*
*Адны бяруць усё ад жыцця,*
*Другія — сэнс шукаюць.*
*Адзін шчыруе для сябе,*
*Другому — ранай боль планеты.*
*Хто сёння праведны, хто не —*
*Усё так заблытана на свеце.*
*На споведзь час ідзе і мой.*
*А на душы бывае горка,*
*Што праляцела старанной*
*Надзей маіх нязбытых зорка.*

Такіх творча адораных людзей і іх творы Алесь Мікалаевіч знаходзіў усюды, дзе бываў. І кніга яго пабудавана як падарожжа па родных яму, любімых мясцінах. У змест ён вынес назвы гэтых вёсак і сёл, і ўжо гэтыя словы для беларуса гучаць як музыка: Мар'іна Горка, Шацк, Блужа, Суцін, Балачанка, Зацітава Слабада (дзе нарадзіўся сам Карлюкевіч), Беразянка, Пухавічы, Скорбаўка, Дукора, Пярэжыр, Рудзенск, Вузляны, Церабель, Турын, Азярычына, Дудзічы, Пціч, Бахаравічы...

З 1935 па 1941 год у Мар'інай Горцы быў Дом творчасці пісьменнікаў Беларусі. Там у свой час адпачывалі і пісалі свае творы класікі беларускай літаратуры Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Кузьма Чорны, Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка... Яны аблюбавалі Пухавіччыну, апелі яе цудоўную прыроду і самабытных людзей. Алесь Мікалаевіч прыводзіць у сваёй кнізе ўспаміны землякоў, якія асабіста добра ведалі гэтых пісьменнікаў, рыбачылі з імі, збіралі грыбы, падоўгу і падрабязна абмяркоўвалі філасофію жыцця. У прыватнасці, прыводзіць вось гэты аповед Яўгена Рамановіча:

"Перад вячэраю мы ўсе, не згаворваючыся, збіраліся каля выхаду з Дома творчасці і ішлі цераз вялікае поле да лесу, потым назад, стараючыся не падымаць пылу нагамі.

У шырокай панаме, палінялай кашулі, парусінавых штанах і скураных сандалях на босую нагу, неяк заўсёды ў сярэдзіне кампаніі, абапіраючыся на вялікі кій, ішоў звычайна Бядуля. Калыхалася спелае жыта, з яго выглядалі сінія, як дзявочыя вочкі, васількі. Хтосьці пачаў задумліва дэкламаваць:

*І тчэ, забыўшыся, рука*
*Заміж персідскага узору*
*Цвяток радзімы васілька...*

— Не ўспамінайце мне Максіма, бо я плакаць пачну, — ціха папрасіў Бядуля. — Для вас Багдановіч толькі паэт, а для мяне гэта чалавек, сябар, які высушыў маё сэрца, як ліст у кнізе. Ён гарэў у мяне на вачах, і я нічога не мог зрабіць. Я не ведаў, як пагасіць яго хворы агонь...

Насустрач нам з лесу, па палявой сцяжынцы, ішоў Якуб Колас. Ён быў таксама, як і ўсе, у лёгкай летняй адзежы, з саламяным брылём на галаве. Правая рука Коласа абапіралася на самаробны кіёк, у левай ён трымаў кошык з грыбамі.

— Во-во, а я меўся зайсці да вас, адпачыць з прагулкі, — яшчэ здалёк загукаў Колас, — там мяне машына будзе чакаць.

— То павернем назад, хлопцы, — загулі ўсе з кампаніі. — Не, мо крышачку пасядзім каля жыта.

Усе абселі, як вераб'і, мяжу і пачалі разглядаць лясныя здабыткі праслаўленага грыбніка.

— Якія там грыбы пад вечар! — махаў рукамі Колас. — Раніцою — іншая справа. Раніцою і баравік галаву з-пад моху высоўвае, каб расы напіцца.

— То што ж гэта вы адзін, Канстанцін Міхайлавіч? — запытаўся Бядуля. — А дзе ж вашы віцебскія госці?

— Адгасцявалі ўжо, — сказаў Колас. — Патрабуюць новую п'есу. Але дзе там — часу няма. Узяўся б ты, Змітрок. Твой Салавей пяе ўжо са сцэны. Добра пяе. Напішы, які ён стаў цяпер, калі скончыў кансерваторыю.

У Доме творчасці ў Пухавічах было ўсё неабходнае для плённай працы пісьменнікаў. Тут былі стары сад з квяцістымі клумбамі, і рэчка, і паэтычны гаёк, і шырокія разлогі палёў і лугоў. Ранняй вясной з'язджаліся сюды літаратары і жылі, многія з сем'ямі, да глыбокай восені. Домам мар і натхненння называлі гэты былы памешчыцкі будынак з добра абсталяванымі пакоямі і вялікай адкрытай верандай..."

Я згодзен з Алесем Мікалаевічам, што ідэалагічная работа дзейсная, калі яна ажыццяўляецца праз рэальных людзей, гісторыі іх жыццяў, праз канкрэтныя ўчынкі. Сістэмы сучасных камунікацый забіраюць нас ад непасрэдных зносін і ўвогуле ад рэальнасці. А жывы навакольны свет — гэта багацце, ніякая віртуальная абалонка яго ніколі не заменіць. Уся кніга Алеся Карлюкевіча якраз гэта даказвае. Ён не прыводзіць гучных патрыятычных фраз, але сам фактычны матэрыял яго працы сведчыць пра глыбіню яго ідэалагагічных, выхаваўчых развагаў. Напрыклад, распавядаючы пра пачынальніка, энергічнага рухавіка беларускай літаратуры савецкага перыяду Міхася Чарота, Алесь Мікалаевіч робіць акцэнт на тое, што ўжо ў 1923 годзе Чарот стварае літаратурную арганізацыю "Маладняк", якая праз два гады назбірае ў свае шэрагі 527 актыўных "штыкоў"... А гэта і ёсць непасрэдная, канкрэтная ідэалагічная работа з маладымі і вельмі таленавітымі людзьмі аўтарытэтнага, разумнага выхавальніка.

Творча адораных маладых людзей і цяпер нямала. Карлюкевіч з узнёсласцю піша пра работу мінскай школьніцы Арыны Клімовіч:




"Кніга "Тапонімы роднага краю", створаная вучаніцай дзясятага класа сярэдняй школы № 23 Мінска Арынай Клімовіч, чые бабуля і дзядуля з Пухавіч і Раўчака Пухавіцкага раёна, чые прадзеды жылі на Пухавіччыне, — сапраўды творчы ўклад у пухавіцкае краязнаўства, рэгіёназнаўства. Яе можна смела выкарыстоўваць на ўроках гісторыі Беларусі, беларускай літаратуры і беларускай мовы, геаграфіі ў агульнаадукацыйных школах Пухавіччыны".

Ад сябе дадам — дзе ж ты, сучасны Міхась Чарот?! Ты ж так патрэбен нашай сённяшняй творчай моладзі.

Асобнае месца ў сваёй кнізе Алесь Мікалаевіч адводзіць гадам Вялікай Айчыннай вайны. З болем піша пра спаленыя вёскі, пра карныя аперацыі акупацыйных войскаў, пра бязлітасных фашыстаў, якія расстрэльвалі і палілі ўжывую старых, жанчын, дзяцей. Не разбіраючы пры гэтым, беларусы яны ці рускія, украінцы ці яўрэі... На Пухавіцкай зямлі ўсе нацыянальнасці заўсёды жылі ў міры і згодзе. Гераізм партызан, усяго беларускага народа ў барацьбе з карычневай чумой, боль чалавечых страт — у кнігах земляка Алеся Карлюкевіча. Ён імкнецца прыгадаць усіх аўтараў, дзе б яны ні знаходзіліся, куды б іх ні закінулі гады вайны і пасляваенныя падзеі. Алесь Мікалаевіч знаходзіць выданні беларускіх аўтараў у Ізраілі, Злучаных Штатах, Канадзе, Аўстраліі... Нікога, па магчымасці, не забывае, разумеючы, што яны таксама пішуць гісторыю нашай краіны.

Пухавіччына ва ўяўленнях Карлюкевіча валодае нейкім магнетызмам, чым і прыцягвае да сябе творчых людзей. Гэтая беларуская зямля натхняе. У доказ сваіх назіранняў Алесь Мікалаевіч прыводзіць верш рускага паэта Андрэя Вазнясенскага. Ён сябраваў з беларускім прадпрымальнікам Яўгенам Будзінасам і наведаў створаны ім на Пухавіцкай зямлі прыватны музей матэрыяльнай культуры "Дудуткі". І таксама натхніўся:

*Ты художник, Женя, художник ландшафта,*
*Коров твоих 110 прошли ТО,*
*Скачет на лугу твоем*
*вишневая лошадка — это все твое!*
*Дон Кихот,*
*ты восстанавливаешь мельницу!*
*И, устав от мерзости, послав всех на,*
*Могилку нарисуешь в саду, за ельничком.*
*"Мне здесь труп не нужен", —*
*сказала жена.*
*А садовый сумрак съедает мелочи.*
*Женщины коричневы, как кисти беличьи,*
*Набухают страстью, как краской кисти,*
*Пора ими красить, чтобы не закисли!*
*Плотинку восстанавливаешь через Птичь*
*И этим устанавливаешь в сердце тишь.*
*Всего мы не объедем.*
*Потом обедаем твоими натюрмортами.*
*Что за дичь,*
*что интеллигенты*
*восстанавливают сельхозяйство!*
*Ты сквозь разбой сердцем*
*расправляешь каждую козявочку.*
*Кто, Женя, восстановит нас с тобой?*
*Мордеем, друг. Подруги молодеют.*
*Не горячитесь.*
*Опробуйте своей моделью,*
*Как "анти" превращается в античность".*

...Прадмову доктара філалагічных навук славутага беларускага культуролага Адама Мальдзіса да кнігі Алеся Карлюкевіча я раю прачытаць двойчы — перад тым, як прачытаць працу Алеся Мікалаевіча, і пасля яе прачытання. Гэта грунтоўны атыкул вядомага гісторыка беларускай літаратуры, і ён прываблівае да сябе як асобна, так і ў сукупнасці з кнігай Алеся Карлюкевіча.

У Магілёўскім педагагічным інстытуце я пачынаў сваю работу асістэнтам кафедры алгебры і геаметрыі. Маладым выкладчыкам тады абавязкова давалі ў нагрузку куратарства студэнцкай групы. Групу "Е" першага курса даручылі і мне. Я яшчэ не моцна адрозніваўся ад сваіх студэнтаў узростам, таму мы хутка знайшлі агульную мову і агульныя інтарэсы. Уключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва сярод студэнцкіх груп інстытута і па агульных паказчыках вучобы і ўдзелу ў грамадскім жыцці да пятага курса занялі першае месца. Рэктарат нас за гэта прэміраваў трохдзённай паездкай у Пушкінскія Горы. А там нам нечувана пашчасціла. Жанчына-экскурсавод, уважліва на нас паглядзеўшы, не стала чытаць традыцыйныя лекцыі. Яна вадзіла нас па пушкінскіх мясцінах — Міхайлаўскае, Трыгорскае, Пятроўскае — і... чытала вершы вялікага рускага паэта.

Я гэта прыгадаў, чытаючы кнігу Алеся Мікалаевіча Карлюкевіча "Пухавіччына: літаратурнае гняздо Беларусі". Чым даўжэй я яе чытаў, тым больш у мяне выспявала жаданне разам з аўтарам праехаць, пахадзіць па яго родных мясцінах. І няхай бы ён гаварыў, гаварыў... А яго ж родная Пухавіччына — мадэль усёй нашай Беларусі. Наша краіна, па сутнасці, вытканая з такіх натхнёных лапікаў. І іх трэба вывучаць, апяваць, перадаваць веданне пра іх новым пакаленням. І нават праз гэтае веданне расказваць пра нашы родныя мясціны чужаземцам. Так, як гэта рабіў археолаг Вячаслаў Капыцін, як робіць пісьменнік Алесь Карлюкевіч. Як гэта могуць зрабіць у любым куточку нашай роднай зямлі настаўнікі са сваімі вучнямі, пісьменнікі, паэты, журналісты, увогуле ўсе ўдумлівыя і творчыя людзі. На мой погляд, гэтая кніга Алеся Карлюкевіча павінна быць у кожнай бібліятэцы, найперш у школьных бібліятэках, паколькі яна патрэбная на ўроках мовы і літаратуры, гісторыі і геаграфіі. Больш за тое, гэта рэальны і пераканаўчы дапаможнік для ідэалагічнай работы — мудры, яркі і дзейсны. Як гэты верш паэтэсы Ганны Рунец з вёскі Азярычына, што на Пухавіччыне:

*Вёска мая, ты — мой родны куточак,*
*Дзе нарадзілася я і жыву.*
*Водар лугоў тваіх, птушак гамонку*
*Я ужо ніколі забыць не магу.*

*Дзе б ні была, у якой я старонцы,*
*Сэрцам імкнуся сюды — так і знай.*
*Вабіць рака і рабіна на гронцы,*
*Сонца і неба блакітнага край.*

*Вёска мая, ты заўсёды прыгожая,*
*Улетку, зімою і ранняй вясной.*
*Так і увосень, калі клён пры дарозе*
*Мяне абсыпае развітальнай красой.*

*Лёсу удзячна, табой ганаруся,*
*Тут я знайшла сваё шчасце ў жыцці.*
*Як да матуліных рук, прыгарнуся.*
*Вёска мая, ты заўсёды жыві!*

Знешне простыя радкі, але якая ў іх сіла жыцця, сіла прыгажосці і прыцягальнасці нашага роднага краю.

**Аляксандр РАДЗЬКОЎ.**